Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР
17
ЛЮТАГА
1977 г.

№ 5 (1155)

Цана 2 кап.

ІДЗЕ

Камсамольцы, юнакі і дзяўчаты краіны, як і ўвесь савецкі народ, з велізарным натхненнем успрынялі пастанову ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». У гэтым дакуменце яны чэрпаюць новыя сілы і энергію, творчае натхненне. Надаючы выключна важнае значэнне мабілізацыі камсамольцаў і моладзі на дастойную сустрэчу 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, далейшаму ўзмацненню ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання юнакоў і дзяўчат, бюро ЦК ВЛКСМ вырашыла правесці з 14 па 26 лютага 1977 года Усесаюзны камсамольскі сход з парадкам дня «Камуністычную ідэйнасць, актыўную жыццёвую пазіцыю — кожнаму камсамольцу!»

ЎСЕСАЮЗНЫ

З 21 па 26 лютага сходы будуць праведзены ў камсамольскіх арганізацыях нашага універсітэта.

Ужо год прайшоў пасля гістарычнага XXV з'езда КПСС. За гэты год нямала зроблена камсамольцамі універсітэта. Аднак на дасягнутым спыняцца нельга. Камсамольская арганізацыя БДУ імя У. І. Леніна працягвае актыўна працаваць над выкананнем рашэнняў XXV з'езда КПСС, імкнуцца дастойна сустрэць 60-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка. Камсамольскі сход заклікан падвесці вынікі дзейнасці кожнай камсамольскай арганізацыі па камуністычнаму выхаванню моладзі і намеціць асноўныя задачы на будучае. Прынцыпова прааналізаваўшы работу па палітычнаму, працоўнаму і маральнаму выхаванню студэнцкай моладзі, мы зможам і ў далейшым павышаць эфектыўнасць камуністычнага выхавання юнакоў і дзяўчат,

КАМСАМОЛЬСКІ

якасна рашаць задачы, пастаўленыя партыяй перад камсамолам ВНУ.

У ходзе сходу нам прадстаіць прааналізаваць усе аспекты падрыхтоўкі да грамадска-палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!», перагледзець узровень і якасць складання асабістых комплексных планаў камсамольцаў — удзельнікаў Ленінскага заліку.

На сённяшні дзень у камсамольскай арганізацыі універсітэта 93 працэнты камсамольцаў маюць грамадскія даручэнні. На Усесаюзным камсамольскім сходзе нам неабходна будзе разгледзець пытанне аб адносінах камсамольцаў да сваіх грамадскіх абавязкаў.

Камсамольскія арганізацыі кожнага факультэта маюць свае ўдарныя камсамольскія справы, ход выканання якіх будзе разгледжан на сходзе.

Усесаюзны камсамольскі павінен стаць для студэнтаў універсітэта значным стымулам іх грамадскай актыўнасці.

У адпаведнасці з планам работы БДУ на гэты навучальны год ва універсітэце адбылася навукова-метадычная канферэнцыя на тэму «XXV з'езд КПСС і задачы павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй», на якой былі разгледжаны актуальныя пытанні далейшага дасканалення методыкі выкладання і навуковай работы, ідэйна-палітычнай і прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

На пленарным пасяджэнні з дакладам «Шляхі, формы і метады павышэння пазнавальнай актыўнасці студэнтаў ў працэсе навучання» выступіў член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР прафесар С. А. Умрэйка. Даклад «Аб ролі выкладчыка кафедры ў арганізацыі самастойнай работы студэнтаў» падрыхтаваў загадчык кафедры педагогікі М. Піскуноў. Дырэктар фундаментальнай бібліятэкі універсітэта І. Арэхоўская і загадчык аддзела праблем студэнцкай моладзі праблемнай лабараторыі сацыялагічных даследаванняў У. Дунаеў расказалі аб інфармацыйным забеспячэнні вучэбна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце і аб ролі сацыялагічных даследаванняў у павышэнні ўзроўню камуністычнага выхавання студэнтаў.

Вопытам арганізацыі і планавання вучэбнага працэсу на сваіх факультэтах і кафедрах падзяліліся дэкан фізічнага факультэта І. Зяцькоў, дэкан біялагічнага факультэта А. Пікулеў, дэкан гістарычнага факультэта І. Царук, загадчык кафедры ядзернай фізікі С. Шушкевіч.

На пасяджэннях 15 секцый канферэнцыі было заслухана і абмеркавана 283 даклады і паведамленні. Навукова-метадычная канферэнцыя прыняла адпаведныя рэкамендацыі.

ПАВЫСІЦЬ ПАЗНАВАЛЬНУЮ АКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

З ДАКЛАДА ЧЛЕНА-КАРЭСПАНДЭНТА АКАДЭМІІ ПЕДАГАГІЧНЫХ НАВУК СССР, ПРАФЕСАРА С. А. УМРЭЙКІ

Гаворачы аб неабходнасці пастаянна ўдасканальваць сістэму народнай адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі кадраў, таварыш Л. І. Брэжнеў адзначаў на XXV з'ездзе КПСС, што гэта асабліва важна зараз, ва ўмовах навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, якая надае іншы, чым раней, характар працы, а, такім чынам, і падрыхтоўцы чалавека да працы. У сучасных умовах, адзначаў Л. І. Брэжнеў, калі аб'ём неабходных для чалавека ведаў рэзка і хутка ўзрастае, ужо немагчыма рабіць галоўную стаўку на засваенне пэўнай сумы фактаў. Важна даваць студэнтам уменне самастойна папаўняць свае веды, арыентавацца ў імклівай плыні навуковай і палітычнай інфармацыі. Але для ўсяго гэтага трэба і паляпшаць падрыхтоўку і перападрыхтоўку прафесарска-выкладчыцкага саставу, і прыводзіць метады навучання ў адпаведнасць з патрабаваннямі жыцця, і забяспечваць вышэйшую школу сучаснымі вучэбнымі дапаможнікамі і тэхнічнымі сродкамі. Усе гэтыя меры павінны быць накіраваны на актывізацыю пазнавальнай мысліцельнай дзейнасці будучых спецыялістаў, іх творчага падыходу да рашэння складаных пытанняў працоўнага і грамадскага жыцця. У ліку гэтых важных праблем галоўнае заключаецца ў тым, каб прывесці метады навучання ў адпаведнасць з патрабаваннямі жыцця, г. зн. гаворка ідзе аб шырокім коле мер, садзейнічаючых лепшай арганізацыі вучэбнага матэрыялу ў лекцыйных курсах, на семінарскіх, лабараторных і практычных занятках, што з'яўляецца важнай умовай павышэння пазнавальнай актыўнасці студэнтаў і стымулявання іх самастойнай работы, выхавання ў іх імкнення да творчага пошуку і фарміравання навыкаў такога пошуку.

Канешне, з улікам вызначыўшайся мадэлі будучага спецыяліста і навукова абгрунтаванай прафесіяграмы змест адукацыі студэнтаў выкладзен у вучэбных праграмах на аснове вучэбнага плана, зацверджанага Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Але, як вядома, вучэбныя планы, а тым больш праграмы падвяргаюцца змяненню рэдка, па некаторых дысцыплінах раз у 5—6 гадоў, і таму не могуць улічыць сучаснага стану навукі, тэхнікі, культуры і вытворчасці. Акрамя таго, у праграме вызначаецца аб'ём ведаў у форме пераліку асноўных навуковых палажэнняў, але не раскрываецца іх сутнасць і доказнасць. У сувязі з тым, што праграмны матэрыял не можа паспяваць за навукова-тэхнічным прагрэсам, а тым больш за перспектывамі яго развіцця, задача ўсіх факультэтаў, кафедр і кожнага выкладчыка і заключаецца ў тым, каб, карыстаючыся навуковымі метадамі, адбіраць для лекцый, семінараў і практыкумаў вучэбны матэрыял, г. зн. новую навуковую інфармацыю, адпавядаючую не толькі сучаснаму стану навукі, тэхнікі, культуры, але і перспектывам іх развіцця.

Пры адборы новай інфармацыі для дасканалення зместу падрыхтоўкі студэнтаў па ўсіх спецыяльнасцях вельмі важна кафедрам падтрымліваць сувязь са спажыўцамі выпускаемых з універсітэта спецыялістаў (навуковымі ўстановамі, прадпрыемствамі, навучальнымі ўстановамі), так як яны забяспечваюць у пэўнай меры развіццё данай галіны гаспадаркі, навукі, культуры і могуць даваць заданні на такога спецыяліста, які ім патрэбен з пункту погляду навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Другім важным мерапрыемствам павышэння ўзроўню вучэбнага працэсу з'яўляецца навукова абгрунтаванае планаванне вучэбнай работы.

Выбарачная праверка паказала, што там, дзе метад сеткавага планавання здзяйсняецца не для справаздачы, а для справы — узровень вучэбнага працэсу значна павысіўся. Ён дазволіў дэканатам і кафедрам атрымаць нагляднае ўяўленне аб узаемаадносінах паміж асобнымі формамі навучання, раней вызначыць самыя напружаныя ўчасткі работы студэнтаў і выкладчыкаў і знайсці больш аптымальнае іх вырашэнне. А самае галоўнае заключаецца ў тым, што прадумана складзеныя і сістэматычна здзяйсняемыя графікі вучэбнага працэсу выключаюць перагрузку студэнтаў, забяспечваюць іх раўнамерную і творчую работу на працягу ўсяго перыяду навучання ва універсітэце.

Задача заключаецца ў тым, каб пераадолець думку, якая яшчэ жыве ў свядомасці некаторых выкладчыкаў, што і без сеткавага планавання выпускалі адукаваных спецыялістаў. Канешне, калі кіравацца вядомым палажэннем, што ісціна канкрэтна для пэўных умоў, то такое сцвярджэнне можна апраўдаць. Сапраўды, у мінулым, пры значна меншых патрабаваннях да спецыяліста, можна было задавольвацца такім планаваннем, калі проста ў плане кожнага выкладчыка ўказваўся пералік тэм па курсу і колькасць гадзін на вывучэнне праз лекцыі і іншыя формы навучання. Цяпер жа, калі да падрыхтоўкі студэнтаў прад'яўляюцца вельмі высокія патрабаванні, такі метад планавання не можа забяспечыць глыбокую тэарэтычную і практычную падрыхтоўку спецыяліста, яго творчыя здольнасці, развіваць ініцыятыву і самастойнасць у рашэнні ўскладзеных на яго як на будучага спецыяліста задач.

Трэцяй умовай, забяспечваючай пазнавальную актыўнасць студэнтаў у працэсе вучэбнай работы, з'яўляецца дасканаленне форм і метадаў навучання. Найбольш сур'ёзным недахопам існуючага вучэбнага працэсу на некаторых кафедрах універсітэта з'яўляецца тое, што ён не патрабуе ад студэнтаў галоўным чынам работы ўзнаўляючага мыслення.

Псіхолагі адрозніваюць два віды мыслення — узнаўляючае (рэпрадуктыўнае) і творчае (прадуктыўнае). Першае характарызуецца тым, што студэнт атрымлівае ад выкладчыка гатовыя веды і, усвядоміўшы, узнаўляе іх у вуснай або пісьмовай форме на экзаменах, залі-ках або ў час калёквіумаў, семінараў і г. д.

Творчае (прадуктыўнае) мысленне характарызуецца тым, што студэнт не атрымлівае цалкам у гатовым выглядзе веды, а на аснове прынцыповых, метадалагічных установак прафесара (выкладчыка), пастаўленай ім перад студэнтамі пошукавай задачы або праблемы, сам здабывае іх і самастойна прымяняе гэтыя веды да рашэння пазнавальных і практычных задач.

Творчыя адносіны студэнтаў да авалодання глыбокімі і трывалымі ведамі не могуць быць развіты, калі на працягу пяці гадоў навучання даваць ім усе веды ў гатовым выглядзе. Творчы падыход да дзейнасці, стымуляванне пазнавальнай актыўнасці можна сфарміраваць і развіць, толькі сістэматычна далучаючы студэнтаў да работы творчага характару.

Рашэнне гэтай задачы здзяйсняецца ў сучасных умовах перш за ўсё пастаноўкай праблемнага навучання як важнай умовы развіцця разумовых сіл, самастойнасці і творчага мыслення студэнтаў. У Беларускім універсітэце ёсць ўжо некаторы вопыт яго рэалізацыі.

Сутнасць праблемнага навучання заключаецца ў тым, што выкладчык у лекцыі не толькі паведамляе аб канчатковых вывадах навукі, невядома адкуль узяўшыхся, але і паказвае «эмбрыялогію ісціны» (А. І. Герцэн), г. зн. узнаўляе ў якойсьці меры шлях яе адкрыцця. Паставіўшы праблему ў тэме лекцыі, выкладчык раскрывае ўнутраныя супярэчнасці, узнікаючыя пры яе вырашэнні, разважае аб іх, абвяргае магчымыя пярэчанні, даказвае ісціннасць. Інакш кажучы, выкладчык дэманструе перад студэнтамі сам шлях навуковага мыслення, прымушаючы іх сачыць за дыялектычным рухам думкі да ісціны, робіць іх як бы саўдзельнікамі навуковага пошуку.

Праблемнае выкладанне ведаў у лекцыі ў параўнанні са звычайным інфармацыйна - паведамляючым мае наступныя перавагі:

— па-першае, яно робіць выкладанне больш доказным;

— па-другое, праблемнае выкладанне вучыць мысліць навукова, дыялектычна, дае студэнтам узор навуковага пошуку;

— па-трэцяе, праблемнае выкладанне больш эмацыянальнае, таму павышае цікавасць студэнтаў да вывучаемага курса.

Акрамя праблемнага выкладання, ужо цяпер на некаторых кафедрах практыкуецца і такі важны спосаб актывізацыі пазнавальнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў, як пошукавая лекцыя-гутарка. Пры праблемным выкладанні ведаў выкладчык у

[Заканчэнне на 2-й стар.].

Навукова-метадычную канферэнцыю адкрывае прарэктар па вучэбнай рабоце У. Р. Івашын.

ПАВЫСІЦЬ ПАЗНАВАЛЬНУЮ АКТЫЎНАСЦЬ СТУДЭНТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

лекцыі, паставіўшы пазнавальную задачу, сам яе ў асноўным вырашае ў працэсе сістэматычнага выкладання тэмы. Але паслядоўна ён пачынае прыцягваць да актыўнага пошуку саміх студэнтаў. Прыпыніўшы выкладанне матэрыялу, ён звяртаецца да аўдыторыі з пытаннямі: «А як бы вы зрабілі на месцы вучоных, сутыкнуўшыся з гэтай праблемай?», «Паспрабуйце сфармуляваць тлумачэнне гэтай незразумелай з'явы» і г. д.

У чым каштоўнасць гэтага метадычнага прыёму? Ён павышае цікавасць і ўвагу студэнтаў да лекцыі-гутаркі выкладчыка, стымулюе засваенне ведаў на самой лекцыі і аблягчае далейшую самастойную работу.

Яшчэ больш высокі ўзровень актыўнасці студэнтаў дасягаецца шляхам прымянення даследчыцкага метадычнага прыёму. Гэты прыём узнік даўно і атрымаў некаторае распаўсюджанне ў Беларускім універсітэце, на розных кафедрах.

Сутнасць яго заключаецца ў тым, што пры планаванні лекцыйнага курса выкладчык наперад вызначае, якія тэмы належыць вывучаць шляхам даследавання. Практычна гэта робіцца так: па той ці іншай тэме курса выкладчыкам ставяцца пытанні, падказваецца методыка даследавання ці пошуку, указваецца літаратура і іншыя крыніцы, неабходныя для ўсведамлення пытанняў і прадмета даследавання. Пасля гэтага студэнты вядуць самастойна, у пазавучэбны час, падрыхтоўку па зададзенаму плану да заняткаў.

Адной з асаблівасцей педагогікі ВНУ з'яўляецца дыскрэтнасць праверкі ведаў студэнтаў. Неабходна сказаць, што практыка арганізацыі кантролю ведаў студэнтаў з дапамогай экзаменацыйных сесій пры ўсіх сваіх вартасцях мае, на нашу думку, сур'ёзныя недахопы. Агульнавядома, што важнейшай умовай паспяховага авалодання ведамі з'яўляецца сістэматычная работа над вучэбным матэрыялам. Даказана, што галоўнай прычынай, перашкаджаючай студэнтам больш паспяхова вучыцца, з'яўляецца (па іх думцы) адсутнасць навыкаў сістэматычнай работы. Наўрад ці будзе памылковым вывад, што ў гэтым у першую чаргу «вінавата» цяперашняя арганізацыя вучэбнага працэсу, якая дапускае, у прыватнасці, праверку ведаў студэнтаў толькі ў час экзаменацыйнай сесіі, што ні ў якой меры не стымулюе сістэматычную працу студэнтаў.

Вопыт многіх выкладчыкаў універсітэта пераконвае нас у тым, што трываласць ведаў прыкметна павышаецца, калі кантроль за бягучай паспяховасцю здзяйсняць шляхам аператыўных кантрольных і праверак (калёквіумаў, кантрольных заданняў і работ, выбарачнага апытвання, ужываючы яго ў працэсе выкладання ведаў праз індуктыўную і дэдуктыўную гутаркі і іншыя метады). Бягучы кантроль, ахопліваючы невялікія дозы інфармацыі, дазваляе ўстанавіць ступень засваення вучэбнага матэрыялу.

Зразумела, што шматлікасць метадаў бягучага і прамежкавага кантролю трэба будаваць разумна ў часе. Калі колькасць праверачных аперацый надта вялікая і кантроль фактычна стаў бесперапынным, ён безумоўна не дасць належнага эфекту (ператворыцца ў «шкалярства»). Але адсутнасць бягучага кантролю таксама недапушчальная. Павінен быць педагагічна апраўдачы пэўны інтэрвал паміж праверкамі, які неабходны для «паспявання» ведаў.

Якія б метады кантролю ні выбіраліся, важна, каб ён дапамагаў выявіць здольнасці студэнтаў, іх уменне самастойна мысліць, замацоўваць у іх навыкі, набытыя ў ходзе навучання, правяраць памяць і ступень яе накіраванасці, уменне правільна і адукавана выказваць свае думкі.

Такія асноўныя патрабаванні, забяспечваючыя развіццё самастойнасці і актыўнасці студэнцкай моладзі ў вучэбным працэсе.

У перапынку ўдзельнікі канферэнцыі знаёмяцца з выстаўкай метадычнай літаратуры, якую арганізавалі супрацоўнікі універсітэцкай бібліятэкі.

Фота Т. САХАШЧЫК.



ВУЧЫЦЬ САМАСТОЙНАСЦІ

Вялікае значэнне тэма самастойнага даследавання набывае ў цяперашні час, у святле новых задач камуністычнага будаўніцтва, вызначаных рашэннямі XXV з'езда КПСС.

Адзіны шлях уплыву навучання на псіхалагічнае развіццё чалавека—гэта шлях праз яго дзейнасць.

Адсюль відавочны і дыдактычны вывад: развіццё ў студэнтаў універсітэта здольнасцей творча, самастойна працаваць магчыма перш за ўсё ў працэсе іх галоўнай дзейнасці — вучэбнай. І чым больш разнастайная гэта дзейнасць, тым больш рознабаковае і змястоўнае развіццё творчых мысліцельных здольнасцей будучых спецыялістаў.

Па якіх жа асноўных напрамках павінна весціся работа, каб забяспечыць выкананне галоўнага патрабавання падрыхтоўкі спецыялістаў ВНУ — прынцыпу максімальнай самастойнай дзейнасці студэнтаў? Такіх напрамкаў два — павышэнне актыўнасці студэнтаў у працэсе акадэмічных заняткаў і дасканаленне арганізацыі іх працы ў пазааўдыторны час. Гаворачы аб першым напрамку, належыць адзначыць, што галоўная задача выкладчыкаў — рашэнне пытання аб тым, як правільна арганізаваць вучэбны працэс, як зрабіць, каб студэнты былі пастаўлены ў становішча не толькі ўважлівых слухачоў, але і актыўных удзельнікаў працэсу навучання. Як на лекцыях, семінарскіх або практычных занятках стымуляваць студэнтаў да актыўнай пазнавальнай дзейнасці з тым, каб садзейнічаць больш поўнаму ўспрыманню імі вучэбнай інфармацыі і ператварэнню яе ў трывалыя і глыбокія веды?

У сувязі з комплексным рашэннем гэтых пытанняў можна вызначыць наступныя праблемы:

— далейшае дасканаленне форм і метадаў развіваючага навучання;

— распрацоўка і эксперыментальная праверка навейшых тэхнічных сродкаў навучання, аблягчаючых працу выкладчыка і студэнтаў у вучэбным працэсе;

— стымуляванне такіх рысаў характару, якія спалучаюць пачуццёвыя і мысліцельныя працэсы ў студэнтаў з тым, каб садзейнічаць іх інтэлектуальнаму развіццю.

Важнейшай асаблівасцю вучэбнай працы студэнтаў у пазааўдыторны час з'яўляецца яе яшчэ больш самастойны характар. Але і тут накіроўваючая роля выкладчыка вельмі вялікая, бо іменна ў гэты час студэнту патрэбна дапамога і парада, асабліва пры планаванні і арганізацыі самастойнай вучэбнай работы.

Рознабаковы вопыт і навуковыя даследаванні дазваляюць вызначыць наступныя ўмовы для забеспячэння плённай разумовай працы:

1. Строга планаваць усю самастойную работу ў пазааўдыторны час.
2. Пачынаючы любую работу, паступова ўваходзіць у яе.
3. Працаваць рытмічна.
4. Прытрымлівацца пэўнай паслядоўнасці і сістэматычнасці.
5. Правільна чаргаваць працу і адпачынак.

М. ПІСКУНОЎ,
загадчык кафедры педагогікі, доктар педагагічных навук.

ГЭТА—ТВОРЧАЯ ПРАЦА

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

Працэс навучання і выхавання высокакваліфікаваных кадраў вельмі складаны. Гэта творчая праца, патрабуючая бесперапыннага ўдасканальвання, пошукаў новых форм і метадаў, умелага выкарыстання ўсёй разнастайнасці вучэбных і грамадскіх рычагоў уздзеяння на моладзь. У гэтым плане выключна важную ролю адыгрывае правільна арганізаваная грамадска-палітычная практыка, якая закліканa навучыць будучага спецыяліста быць грамадска-актыўным, набыць ужо ў сценах універсітэта навыкі, вопыт арганізатарскай, лекцыйнай, прапагандысцкай работы, дапамагчы яму выканаць ленінскі запавет «вучыцца камунізму».

На гістарычным факультэце на працягу шэрагу год дэканат, партыйная і камсамольская арганізацыі шукалі найбольш прыймальныя формы арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі, дабіваліся атрымання прыкметных рэзультатаў.

На сённяшні дзень мы можам сказаць, што на факультэце ёсць сістэма арганізацыі грамадска-палітычнай практыкі, якую мы зусім не лічым закончанай, дасканалай. Жыццё, вопыт іншых ВНУ падказвае нам напрамкі і шляхі яе ўдасканальвання.

Мы арганізуем грамадска-палітычную практыку па двух напрамках:

I. Праз вучэбны працэс, што ўключае ў сябе:

а) разам з высокай агульнай паспяховасцю барацьбу студэнтаў за добрае і выдатнае веданне дысцыплін грамадска-палітычнага цыклу;

б) напісанне рэфератаў па грамадскіх дысцыплінах;

в) праслухоўванне абавязковых спецкурсаў на кожным курсе ў плане грамадска-палітычнай практыкі.

II. Пазавучэбны працэс, куды ўваходзяць:

а) ахоп максімума студэнтаў грамадскімі даручэннямі і сістэматычны кантроль за іх выкананнем;

б) вучоба ў «Школе студэнцкага актыву», дзе займаецца звыш 200 студэнтаў;

в) вучоба 50 студэнтаў у факультэцкай «Школе маладога лектара»;

г) заняткі студэнтаў на факультатыве экскурсаводаў;

д) удзел студэнтаў у рабоце «Школы юнага гісторыка», у правядзенні факультатыва па «Гісторыі сусветнага мастацтва», які арганізаван у СШ № 41 г. Мінска і ў падшэфным Стаўбцоўскім раёне.

е) прадастаўленне студэнтам шырокіх паўнамоцтваў і аказанне ім метадычнай дапамогі ў іх рабоце ў акадэмічнай, культурна-масавай, шэфскай камісіях; у рабоце студсавета, СНТ, у арганізацыі працоўных спраў, у рабоце КІДа, пры праходжанні грамадска-палітычнай практыкі ў перыяд піянерскай і педагагічнай практыкі.

III. Падводзяцца вынікі грамадска-палітычнай практыкі разам з ленінскім залікам, і рэзультат яе ўносіцца ў адпаведную графу распрацаванага на факультэце спецыяльнага атэстата.

Выхаванне будаўнікоў камуністычнага грамадства, спалучаючых у сабе духоўнае багацце, смеласць мыслення, маральную чысціню і фізічную загартоўку — вось высакародная мэта, да якой імкнуцца прафесарска-выкладчыцкі калектыў, грамадскія арганізацыі гістарычнага факультэта.

І. ЦАРУК,
дэкан гістфака.

Астаткія матэрыялы канферэнцыі будуць надрукаваны ў наступных нумарах.

ЯКАСЦЬ ВУЧЭБНАЙ РАБОТЫ

Кафедры фізічнага факультэта ўдзяляюць вялікую ўвагу павышэнню ўзроўню вучэбнага працэсу, здзяйсняючы штодзённы кантроль за якасцю чытання лекцый, правядзеннем семінарскіх, практычных і лабараторных заняткаў. Ад навукова-метадычнага ўзроўню ўсіх відаў аўдыторных заняткаў, педагагічнага майстэрства прафесарска-выкладчыцкага саставу, творчай актыўнасці студэнтаў, іх мэтазгоднa арганізаванай, штодзённай самастойнай работы залежыць і эфектыўнасць усяго вучэбнага працэсу.

Формы і метады кантролю па арганізацыі вучэбнага працэсу разнастайныя і спецыфічныя не толькі ў рамках факультэта, яны асаблівыя для курса, акадэмічнай групы і нават для кожнага студэнта паасобку.

На малодшых курсах фізічнага факультэта ў асноўным вучэбны працэс забяспечваюць тры кафедры: дзве факультэцкія — кафедра агульнай фізікі і кафедра вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, адна агульнауніверсітэцкая кафедра. Кожная з кафедр факультэта на працягу двух гадоў курыруе адзін з курсаў, пачынаючы з першага, і пасля другога — перадае спецыялізуючай кафедры. Яны ж забяспечваюць і сеткавае планаванне, здзяйсняюць узгадненне аб'ёму вучэбнага матэрыялу для самастойнай работы студэнтаў па кожнай з дысцыплін вучэбнага плана.

Асаблівасцю сеткавага планавання на фізічным факультэце для спецыялізуючых кафедр, калі спецыялізацыя пачынаецца з III курса, з'яўляецца тое, што вучэбны працэс забяспечвае шэсць факультэцкіх і пяць агульнауніверсітэцкіх кафедр. Зыходзячы з 36-гадзіннай тыднёвай нагрузкі аудыторных заняткаў, спецыялізуючая кафедра забяспечвае толькі дзве гадзіны ў тыдзень у 5-м семестры і тры гадзіны — у 6-м. Агульны тыднёвы бюджэт часу студэнта, уключаючы і яго самастойную работу, складае 58—60 гадзін. У сувязі з гэтым асаблівасцю сеткавага планавання вучэбнага працэсу спецыялізуючых кафедр з'яўляецца строгае і дакладнае яго ўзгадненне з усімі кафедрамі, забяспечваючымі як агульныя, так і спецыяльныя курсы па ўсіх дысцыплінах вучэбнага плана.

Неабходна, каб спецыялізуючая кафедра перыядычна 2—3 разы ў семестр сумесна з усімі выкладчыкамі, якія вядуць семінарскія, практычныя, лабараторныя заняткі і чытаюць лекцыйныя курсы, пастаянна абмяркоўвалі ход вучэбнага працэсу, бягучую паспяховасць і індывідуальную работу кожнага студэнта паасобку, акадэмічнай групы ў цэлым па сукупнасці ўсіх дысцыплін. Такое абмеркаванне дазволіць спецыялізуючай кафедры кантраляваць узровень вучэбнага працэсу, эфектыўнасць аўдыторнай і самастойнай работы студэнтаў, мэтазгоднасць і неабходнасць правядзення індывідуальных кансультацый, вызначыць меры індывідуальнага падыходу да кожнага студэнта, стварыць больш творчую абстаноўку ў акадэмічнай групе ў цэлым, а такім чынам і кантраляваць узровень падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

І. ЗЯЦЬКОЎ,
дэкан фізфака.

З ПАРТЫЙНЫМ ПАДЫХОДАМ

Калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта актыўна ўключыўся ва Усесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў у працы, за выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі, за дастойную сустрэчу 60-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Распрацаваны, прыняты і ўжо здзяйсняюцца важныя мерапрыемствы, накіраваныя на далейшае паляпшэнне вынікаў работы калектыву выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў у святле патрабаванняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ і іншых партыйных рашэнняў.

Павышэнню эфектыўнасці і якасці работы павінны садзейнічаць органы народнага кантролю, канцэнтруючыя свае намаганні на далейшым паляпшэнні праверкі выканання рашэнняў партыі і ўрада, планаў дзесятай пяцігодкі. «Каб павысіць дзейснасць такіх праверак, — гаварылася ў перадавой «Правды» ад 13 красавіка 1976 года, — дазорным належыць глыбока разбірацца ў становішчы спраў, раскрываць дадатковыя магчымасці росту вытворчасці, падвяргаць крытыцы тых, хто не выкарыстоўвае усіх рэзерваў, праяўляе самазаспакоенасць і кансерватызм». З улікам гэтых агульных задач галаўная група народнага кантролю і групы народнага кантролю факультэтаў і падраздзяленняў БДУ імя У. І. Леніна прымаюць актыўны ўдзел у барацьбе за павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, разгортванне актуальных навуковых даследаванняў, беражлівыя адносіны да сацыялістычнай уласнасці, прытрымліванне рэжыму эканоміі, паляпшэнне бытавога і культурнага абслугоўвання выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў.

Выконваючы мерапрыемствы, якія былі намечаны ў сувязі з пастановай ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР», партком універсітэта і партыйныя бюро факультэтаў і іншых падраздзяленняў сталі больш удзяляць увагі рабоце народных кантралёраў, больш канкрэтна накіроўваць яе, ствараць дазорным неабходныя ўмовы для паспяховага выканання кантрольных функцый, для забеспячэння арганічнага адзінства праверкі, папярэджання і выпраўлення недахопаў.

У час справаздач і выбараў груп народнага кантролю, якія адбыліся ў 1976 годзе, партком і пярвічныя партыйныя арганізацыі правялі вялікую арганізацыйную работу па падрыхтоўцы і правядзенню на належным узроўні канферэнцый і сходаў, па падбору ў састаў уноў выбраных ГНК працавдольных, актыўных і прынцыповых таварышаў. У рабоце справаздачных сходаў і канферэнцый актыўна ўдзельнічалі сакратары і члены партыйнага камітэта і партыйных бюро факультэтаў і іншых падраздзяленняў. Ў ліку выбраных народных кантралёраў 96 камуністаў і 57 камсамольцаў.

Удзяляецца ўвага далейшаму дасканаленню планавання дзейнасці ГНК, распрацоўцы гадавых перспектыўных планаў, якія ўключаюць найбольш актуальныя пытанні, маючыя прынцыповае значэнне для паляпшэння якасці ўсёй нашай работы. Перыядычна праводзяцца нарады старшынь груп народнага кантролю факультэтаў (падраздзяленняў), заняткі ў школе народных кантралёраў. Дзейнасць народнага кантролю рэгулярна асвятляецца ў газеце «Беларускі універсітэт». З артыкуламі аб рабоце народных кантралёраў на старонках шматтыражнай газеты часта выступаюць намеснік сакратара парткома па народнаму кантролю, намеснікі сакратароў партыйных бюро факультэтаў, кіраўнікі сектараў ГНК.

З мэтай павышэння актыўнасці народных кантралёраў, адказнасці за даручаную справу ўсё шырэй распаўсюджваецца практыка пастаянных даручэнняў членам ГНК (акрамя ўдзелу ў плануемых праверках, ім даручаецца пастаянны ўчастак работы — здзяйсненне кантролю за тым ці іншым бокам дзейнасці універсітэта, факультэта, падраздзялення).

На адным з пасяджэнняў парткома ў канцы мінулага года было абмеркавана пытанне «Аб ходзе выканання галаўной групай народнага кантролю пастановы ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР». Папярэдне работа групы была праверана камісіяй на чале з загадчыкам няштатнага аддзела арганізацыйнай работы Кастрычніцкага раённага камітэта народнага кантролю горада Мінска дацэнтам Я. Тагуновым.

У прынятай па данаму пытанню пастанове партком адзначыў, што галаўной групай народнага кантролю праведзена пэўная работа па выяўленню і ліквідаванню недахопаў у вучэбнай, навуковай і гаспадарчай дзейнасці факультэтаў, служб і падраздзяленняў універсітэта, па здзяйсненню кіраўніцтва групамі народнага кантролю. Разам з тым у рабоце ГНК БДУ маюцца і недахопы. У прыватнасці, нерэгулярна правяралася выкананне выносімых групай рашэнняў, усё яшчэ нізкая рэзультатыўнасць асобных праверак. Галаўная група народнага кантролю недастаткова выкарыстоўвала ў сваёй працы такія формы праверак, як правядзенне рэйдаў, аглядаў, слабым быў кантакт з «Камсамольскім пражэктарам». Пры ГНК няма пастаяннага актыву. У пастанове парткома былі намечаны канкрэтныя мерапрыемствы для ліквідацыі адзначаных недахопаў, частка з якіх галаўной групай ужо здзейснена. **У снежні 1976 года быў праведзен агульнаўніверсітэцкі сход актыву груп народнага кантролю, на якім абмеркаваны задачы народных кантралёраў універсітэта па далейшаму паляпшэнню іх работы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ, пастановы ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР». Аказана дапамога старшыням груп народнага кантролю, упершыню выбраным на гэтую пасаду, перш за ўсё ў планаванні работы, складанні перспектыўных планаў. На кожным пасяджэнні галаўной групы народнага кантролю або яе бюро заслухоўваецца справаздача старшыні адной з факультэцкіх груп, работа якой напярэдне правяраецца сектарам аргработы і галоснасці. У перспектыўным плане работы ГНК БДУ намечаны таксама правядзенне агляду сродкаў галоснасці, заняткаў у школе народных кантралёраў з запрашэннем на некаторыя з іх работнікаў камітэтаў народнага кантролю раёна і горада.**

Пытанне аб рабоце груп народнага кантролю, аб выкананні імі пастановы ЦК КПСС «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю ў Латвійскай ССР» абмяркоўвалася таксама на сходах некаторых факультэцкіх партыйных арганізацый (такія сходы прайшлі, напрыклад, на юрыдычным і механіка-матэматычным факультэтах). Прынятыя на гэтых сходах рашэнні, бясспрэчна, будуць садзейнічаць паляпшэнню работы народных кантралёраў, павышэнню яе эфектыўнасці і дзейснасці. Мэтазгодна абмеркаваць гэта пытанне і на іншых факультэтах (падраздзяленнях), уключыўшы яго на парадак дня партыйнага сходу або пасяджэння партыйнага бюро. Партыйныя арганізацыі павінны пастаянна трымаць у полі зроку дзейнасць народных кантралёраў, ствараць неабходныя ўмовы для яе паспяховага здзяйснення.

І. ЦІШКЕВІЧ,
намеснік сакратара парткома універсітэта па народнаму кантролю.

Студэнт і НДР

Адным з важнейшых фактараў павышэння прафесійнай падрыхтоўкі ў ВНУ з'яўляецца ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце. На шматлікіх кафедрах і факультэтах добра пастаўлены навукова-даследчая і гасдагаворная работы. Студэнты актыўна прыцягваюцца да навукова-даследчай дзейнасці. Як паказала праверка, на кафедрах тэарэтычнай фізікі, атамна-малекулярнай фізікі і фізікі паўправаднікоў НДР арганічна ўваходзіць у вучэбны працэс, і студэнты старэйшых курсаў працуюць над рашэннем канкрэтных задач, па якіх потым пішуць дыпломныя работы. На кафедры паўправаднікоў працуе семінар з удзелам не толькі студэнтаў IV—V курсаў, але і выкладчыкаў і супрацоўнікаў, што з'яўляецца добрай школай для студэнтаў і мае вялікае выхаваўчае значэнне.

Шырока прыцягваюцца да выканання НДР і студэнты філалагічнага факультэта. Навуковая прадукцыя факультэта за 1976 год выразілася ў напісанні шэрагу падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, манаграфій (20), зборнікаў вершаў (9), навуковых артыкулаў (121), у рабоце над якімі прынялі ўдзел звыш трохсот студэнтаў (329). Па асноўных напрамках даследаванняў факультэт цесна звязан з інстытутамі літаратуры, моваznаўства, этнаграфіі АН БССР.

Асноўная маса студэнтаў, якія займаюцца на кафедрах навуковай работай, — гэта студэнты IV—V курсаў. Усё яшчэ слаба прыцягваюцца да навуковай работы студэнты малодшых курсаў, што, мабыць, звязана з недастатковай спецыяльнай падрыхтоўкай і інфармацыяй аб спецыяльнасцях на факультэце, кафедры.

Адной з форм удзелу студэнтаў у НДР з'яўляецца выкананне гасдагаворных работ. На кафедрах матэматычнага забеспячэння сістэм кіравання і агульнага праграміравання працуюць 35 і 100 студэнтаў III—V курсаў адпаведна. Тэматыка работ цесна звязана з асноўным навуковым напрамкам кафедр і мае важнае народнагаспадарчае значэнне. Пры такім прыцягненні студэнтаў узнікаюць цяжкасці ў кантролі за канкрэтным укладам кожнага студэнта, і кафедрам, мабыць, належыць больш дакладна праверыць улік выканання і прадстаўлення да аплаты работы кожнага студэнта паасобку.

Прыцягненне студэнтаў да ўдзелу ў навуковай і гасдагаворнай рабоце дапамагае ім атрымаць добрыя практычныя навыкі, правільна планаваць сваю работу і дазваляе да заканчэння навучання ва універсітэце прадставіць цікавую як у навуковых, так і практычных адносінах работу.

М. САКАЛОЎ,
загадчык сектара навуковай работы ГНК універсітэта.

СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

Выпуск № 13

ПАЛАЖЭННЕ

АБ АГЛЯДЗЕ СРОДКАЎ ГАЛОСНАСЦІ Ў РАБОЦЕ ГРУП НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

Агляд сродкаў галоснасці народнага кантролю праводзіцца з 10 па 20 мая 1977 г.

У аглядзе прымаюць удзел факультэцкія групы народнага кантролю, а таксама групы народнага кантролю іншых структурных падраздзяленняў універсітэта.

Агульнае кіраўніцтва аглядам здзяйсняе камісія, зацверджаная на пасяджэнні універсітэцкай групы народнага кантролю.

МЭТАЙ АГЛЯДУ З'ЯЎЛЯЕЦЦА:

— паляпшэнне стану галоснасці як важнейшага прынцыпу дзейнасці груп народнага кантролю, яго ананка, а таксама эфектыўнасць выкарыстання ў рабоце груп розных форм галоснасці;

— абагульненне накопленага вопыту і прыняцце мер для шырокага распаўсюджання лепшых рэзультатаў, папулярызацыі найбольш эфектыўных метадаў укаранення галоснасці ў паўсядзённую работу народных кантралёраў;

— павышэнне масавасці ў рабоце ГНК, больш шырокае прыцягненне членаў факультэцкіх калектываў да дзейнасці груп народнага кантролю, да барацьбы за далейшае ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны і сацыялістычнай законнасці, выкаранення праяў безгаспадарчасці і бюракратызму, неашчаднасці.

АГЛЯДУ НАЛЕЖЫЦЬ:

— рэгулярнасць выступленняў старшынь груп, народных кантралёраў на партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх сходах калектываў факультэтаў з паведамленнямі аб рабоце груп народнага кантролю і прынятых мерах для ліквідацыі выяўленых недахопаў;

— паяўнасць і афармленне стэндаў груп народнага кантролю, асвятленне ў іх дзейнасці груп;

— перыядычнасць публікацыі матэрыялаў аб рабоце народных кантралёраў у факультэцкім насценным друку і ва універсітэцкай шматтыражнай газеце «Беларускі універсітэт»;

— прапаганда лепшых форм і метадаў правядзення праверак, аглядаў, рэйдаў, паказ дзейнасці народных кантралёраў па папярэджанню недахопаў;

— арганізацыя прыёму студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў у групах, аператыўнасць разгляду іх прапаноў, заяў і скаргаў;

— пастаноўка ўліку выкананай работы ў групах.

Для правядзення агляду сродкаў галоснасці зацверджана камісія ў саставе:

А. АКІНЧЫЦ (старшыня)
Я. ТАРАСЕВІЧ
І. ЛІТВІНОЎСКІ
В. ЯНОЎСКІ
Л. ПЯСТКОЎСКАЯ
Г. ВАСІЛЬЕВА.

АРГСЕКТАР ГНК БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ

У 1976 годзе групай народнага кантролю геаграфічнага факультэта было праведзена 18 праверак, у іх ліку: сектарам быту — 6, вучэбным — 5, навуковым — 3 і аргсектарам — 4.

Вельмі неабходнымі з'яўляліся праверкі стану быту і культурна-масавай работы сярод студэнтаў у інтэрнатах, праверкі правільнасці выкарыстання стыпендыяльнага фонду І курса і фонду матэрыяльнай дапамогі, наведваемасці студэнтамі заняткаў па грамадскіх дысцыплінах, у выніку якіх выявілася недысцыплінаванасць студэнтаў V і VI курсаў (Прэс, Яльчык, Фіскова, Русакова, Сухадолец, Марціновіч, Башарымава і інш.).

Добра прайшла праверка выкарыстання электраэнергіі ў памяшканнях геаграфічнага факультэта, прытрымлівання правілаў тэхнікі бяспекі і выканання супрацьпажарных мерапрыемстваў. Пастаянна гэтай работай займаецца член групы В. Калечыц.

Вялікую дапамогу дэканату ГНК аказала па выяўленню студэнтаў, якія ухіліліся ад паездкі на сельгасработы і зрабілі сабе няпланавыя канікулы. Спіс такіх студэнтаў перададзен у дэканат, партбюро і камсамольскаму камітэту.

Па рэзультатах праверкі народных кантралёраў існуючае паляпшэнне ў размеркаванні вучэбнай нагрузкі сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу праведзена на кафедрах.

Група народнага кантролю адзін раз давала справаздачу аб сваёй рабоце на пасяджэнні партбюро. З інфармацыяй аб рабоце ГНК выступаў на партыйным сходзе старшыня групы.

Група працавала ў цесным кантакце з камсамольскім камітэтам і студсаветам, узгадняла сваю штодзённую дзейнасць з партбюро і дэканатам факультэта, праводзіла пасяджэнні з абмеркаваннем стану работы і важнасці задач, пастаўленых перад народнымі кантралёрамі.

Д. КАРУЛІН,
старшыня ГНК геаграфічнага факультэта.

КОНКУРС

НА ЛЕПШЫ ЭСКІЗ ЗНАЧКА І ЭМБЛЕМЫ УНІВЕРСІТЭТА

Мясцком, камітэт камсамола і прафком БДУ аб'яўляюць **конкурс** на лепшы эскіз значка для студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта і на лепшы эскіз эмблемы універсітэта, якая будзе выраблена ў аб'ёмным варыянце для святочных дэманстрацый.

Конкурс праводзіцца з 15 па 31 сакавіка 1977 г. Напярэдадні падвядзення вынікаў конкурсу будзе адкрыта выстаўка прадстаўленых работ. Эскізы выконваць у чорна-белым або каляровым варыянтах.

За лепшыя работы ўстаноўлены наступныя прэміі:

ЗА ЛЕПШЫ ЭСКІЗ ЗНАЧКА

І прэмія	30 руб.
ІІ прэмія	20 руб.
ІІІ прэмія	10 руб.

ЗА ЛЕПШЫ ЭСКІЗ ЭМБЛЕМЫ

І прэмія	40 руб.
ІІ прэмія	25 руб.
ІІІ прэмія	10 руб.

Вынікі конкурсу будуць падведзены да 10 красавіка 1977 г.

Эскізы накіроўваць у камітэт камсамола БДУ.

Запрашаем усіх жадаючых прыняць удзел у конкурсе.

Мясцком, камітэт камсамола, прафком БДУ.

ГУЧЫЦЬ СЛОВА...

Знаходжуся ў лінгафоннай лабараторыі **БДУ** на філалагічным факультэце. Загадчык гэтай лабараторыі — Віталь Вітальевіч Шувагін. Лабарант — Генадзь Мікалаевіч Юрчанка. У асноўным лабараторыя прызначана для больш паглыбленага вывучэння замежных моў: англійскай, французскай, іспанскай і нямецкай. Для гэтага прызначаны і два кабінеты — праслухоўвання і лінгафонны.

— У цяперашні час работа з агульнымі матэрыяламі стала неад'емнай часткай вучэбнага працэсу, таму што прыносіць эфектыўныя вынікі ў галіне вымаўлення, развіцця навыкаў вуснай мовы, — кажа Генадзь Мікалаевіч.

Запісваюцца не толькі замежныя, але і рускія тэксты. Гэта дапамагае замежным студэнтам у вывучэнні рускай мовы. Шырока выкарыстоўваецца лінгафоннае абсталяванне і для навучання замежных студэнтаў з Малі, Ганы. Спачатку выкладаюцца звесткі аб рускай фанетыцы, затым веды замацоўваюцца пры праслухоўванні тэкстаў.

Лабараторыя мае сваю фанатэку. Ёсць пяць магнітафонаў. У кабінетах аўтаматызавана кіраванне дыяпраектарамі і кінапраектарамі.

Многія выкладчыкі, напрыклад, М. Антропаў, І. Роўда выкарыстоўваюць для правядзення заняткаў тэхнічныя сродкі. А выкладчыца французскай мовы С. Любіч на занятках паказвае агучаныя дыяфільмы.

Вельмі цікавае мерапрыемства арганізавала дацэнт філфака В. Захарава. Кожны год першакурснікі ў час фальклорнай практыкі запісваюць песні, прымаўкі і прыказкі беларускіх вёсак на магнітафонную стужку. І гучыць потым у лабараторыі жывая народная мова...

Н. РАСОХА.

З гісторыі...

АЎТАМАТЫКА Ў СТАРАЖЫТНАСЦІ

У наш час тэхнічнага прагрэсу цікава ўспомніць што такія словы, як «аўтаматыка» і «аўтамат», прыйшлі ў еўрапейскія мовы ад... старажытных грэкаў. Усё, што адбываецца само па сабе, прыпадабняецца дзеянням чалавека або жывёліны — такія былі значэнні гэтых слоў многа стагоддзяў назад. А наколькі дасканалымі і цікавымі былі тады аўтаматы, гавораць наступныя факты.

Выдатны грэчаскі вучоны Герон, які займаўся канструяваннем розных механізмаў, стварыў у ІІ ст. да н. э. лялечны тэатр, заснаваны на аўтаматыцы.

Адзін з такіх аўтаматаў уяўляў невялікую калонку, наверсе якой знаходзіўся макет сцэны, закрытай дзверцамі. Яны адчыняліся і зачыняліся, і на сцэне, акт за актам, гледачам паказвалі драму пра пераможцаў горада Троі.

З дапамогай схаванай складанай сістэмы — зубчатых перадач, шнуроў, сціснутага паветра — лялькі дэманстравалі збудаванне і спуск на ваду парусных судоў. Караблі плылі па моры, суправаджаемыя гарэзлівымі дэльфінамі. Затым налятала бура, і людзі хаваліся ў пучыне...

Цікава, што гэты тэатр быў вельмі малых памераў. Як гаварыў яго вынаходнік, у гледачоў не павінна ўзнікаць падазрэнняў, што замест механізмаў унутры знаходзіцца чалавек.

А вядомы ў грэкаў падарожнік Паўсаній (ІІ ст. н. э.) пісаў аб механізме на іпадроме Алімпіі, дзе праходзілі вядомыя ў старажытнасці атлетычныя гульні. На старце бегавых спаборніцтваў уладкоўвалі пастамент з меднымі фігурамі арла і дэльфіна. Калі аўтаматыку, схаваную ў пастаменце, прыводзілі ў дзеянне, арол узлятаў у паветра, а дэльфін апускаўся на зямлю.

Пазней даследчыкі выказалі здагадку: паколькі Алімпійскія гульні некалі пачыналіся пасля заходу сузор'я Дэльфіна і ўсходу сузор'я Арла, архітэктар адлюстраваў гэты момант у адпаведных механічных фігурах.

У. БРАБІЧ,
Г. ПЛЯТНЁВА.

ЗДЫМАЮЦЬ ФОТА-АМАТАРЫ

НА ЗДЫМКАХ:

Партнёр для пачынаючых;

«Гаспадароў няма дома. Пазваніце вечарам».

Фота **Н. Дораш.**



Я гутару з членамі агітацыйнай брыгады фізічнага факультэта Вольгай Канавалавай і Аленай Гусеўскай, студэнткамі ІІ курса.

— Дзяўчаты, калі ўзнікла ідэя стварэння вашай агітбрыгады?

— Усё пачалося з «бульбы». Як і ўсюды, на сельгаспрацах студэнт не можа без песні. У нас спявалі многія, і гэта навяло на думку: а чаму б нам не стварыць сваю групу і не выступіць з канцэртам? Сказана — зроблена! Склалі праграму, у якую

ФІЗІКІ? ЛІРЫКІ?

ўвайшлі і песні, і сцэнкі-мініяцюры са студэнцкага жыцця. Гледачы, у асноўным мясцовая моладзь, вельмі цёпла прынялі наша выступленне. Ну, а пасля мы выйшлі пераможцамі ў аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці факультэта. Агітбрыгада набыла свой «твар», зацвердзілася як мастацкі калектыў.

— Вы выступаеце толькі на сваім факультэце?

— Не, не толькі. Вось, напрыклад, не так даўно мы былі ў падшэфнай школе № 56 г. Мінска.

Не абышлося і без здарэнняў. Усе музычныя нумары мы рыхтавалі ў суправаджэнні фартэпіяна. І можаце сабе ўявіць наша становішча, калі мы даведаліся, што ў школе фартэпіяна няма. Тады нашы хлопцы за лічаныя хвіліны, якія заставаліся да пачатку канцэрта, «перастроіліся» на гітары. І выступленне прайшло паспяхова. Аб гэтым мы можам меркаваць па рэакцыі публікі. Былі і смех, і слёзы, і вялікае задавальненне, якое не заменіш нічым.

Мы збіраемся прыступіць да складання новай праграмы, прысвечанай 60-годдзю Кастрычніка. Спадзяёмся, што ў гэтым нам дапамогуць сябры-аднакурснікі.

І. АЛЕКСАНДРОВІЧ.

ЦІ ЎМЕЕМ МЫ ГАВАРЫЦЬ?

«Добрая, пакуль рот не адкрые», — вам, напэўна, прыходзілася чуць аб кім-небудзь падобнае. Ад манеры гаварыць больш, чым ад усіх нашых знешніх даных, залежыць уражанне, якое мы робім на людзей. Калі ўменне апранацца — люстра нашага густу, то ва ўменні весці гутарку і проста ўступаць у кароткую выпадковую размову, задаваць пытанні і адказваць праяўляюцца добразычлівасць, выхаванасць, унутраная культура, інтэлект, нарэшце.

Прыходзіць у дом, дзе сабралася кампанія, малазнаёмая дзяўчына. Многія бачаць яе ўпершыню і прыкмячаюць: «непрыгожая», «нязграбная»... Але вось дзяўчына ўступіла ў агульную размову. Голас спакойны, прыемны. І неяк адразу ўсе перасталі заўважаць, што яна непрыгожая, а ў канцы вечара многія захапляліся ў душы: «Якая абаяльная!».

А яна ж не вызначалася красамоўствам, не абрушвала каскады анекдотаў, не расказвала ашаламляльных гісторый. Проста гаварыла, як усе, аб новай выстаўцы, аб планах на лета... Гаварыла і слухала.

Усе этычныя законы — вы, вядома, гэта ведаеце — вынікаюць ад добрых, уважлівых адносін да людзей. Таму і гаварыць трэба так, каб не раздражняць людзей, не крыўдзіць. І няцяжка, прыгледзеўшыся да тых, з кім даводзіцца мець зносіны, зрабіць для сябе вывады, якія манеры засвоіць, якія забыць.

Хіба прыемныя, напрыклад, крыклівыя людзі?

А як цяжка ў зносінах з тым, хто абавязкова стараецца лідэрствацаць у агульнай размове, без канца ўсіх абрываe: «Гэта не так!» — і прымушае: «Паслухайце мяне! Таня! Юра! Слухайце ўсе!» Калі вы сапраўды можаце расказаць штосьці цікавае — вас пачуюць, калі ж вашa інфармацыя мала каго цікавіць — ці варта яе ўсім навязваць?

Не лягчэй і з чалавекам, які прымае нават самыя бяскрыўдныя жарты на свой рахунак. Быццам і не пазбаўлен ён зусім пачуцця гумару, сам, здараецца, жартуе, але вось калі яго закрануць... Уменне адносіцца да сябе, сваіх слабасцей з гумарам усяго толькі прыбаўляе прывабнасці: з вамі гаварыць лёгка і прыемна, не трэба трымаць сябе ў кайданах, каб незнарок не разазлаваць вас.

Дасціпны чалавек часцей за ўсё — душа кампаніі. Але толькі дасціпны, гэта значыць з вострым, жывым розумам, своеасаблівым мысленнем, а зусім не той, у каго ў абыходзе абкатаныя жарты, якія перайшлі ў разрад пошласцей: «квітнею і пахну», «выбачай, пасунься» і інш. У патугах на востры розум, як і ў імкненні выглядаць самым разумным, самым значным, чалавек заўсёды прайграе. Губляе натуральнасць, прастату. Такую ж паслугу аказваюць жаргонныя словы. «Клёва», — адказвае дзяўчына на пытанне, ці спадабаўся ёй фільм. Фільм — «клёвы», знаёмы хлопец — «кадр у парадку»... І ўсё гэта «ўпрыгожвае» дзяўчыну, як татуіроўка на руках. У маладых прага да жаргонных слоў. Напэўна, камусьці бачыцца ў гэтым своеасаблівая форма самасцвярджэння: вось я які, лічы і сучасны. І не разумееш часам: ці можа гэты чалавек думаць і ўвасабляць свае думкі ў нармальныя словы.

Нам усім нярэдка даводзіцца ўдзельнічаць у розных спрэчках. Свой пункт гледжання трэба абараняць. Але калі хто-небудзь катэгарычна заявіць: «Гэта маё меркаванне, і вы мяне не пераканаеце», — то наўрад ці захочацца працягваць размову з такім субяседнікам. Той, хто не засвоіў, што кожны мае свой погляд на рэчы і да гэтага трэба адносіцца ўважліва, нярэдка пераходзіць у спрэчцы за недахопам аргументаў на асобы: «А ты заўсёды такі! Ты проста косны! У цябе мазгі набок!» Стоп! Гэта ўжо не размова.

Адна з самых прыемных якасцей субяседніка — уменне слухаць. Асабліва калі размова адзін на адзін. Заўважалі? Калі чалавек слухае вас уважліва, а не чакае з нецярпеннем моманту, каб уставіць сваё і адвесці размову ў бок, вы міжволі пранікаецеся да яго сімпатыяй і пры выпадку скажаце: ветлівы, добразычлівы — і не памыліцеся. Тыя, хто ўмее слухаць, лёгка выклікаюць прыхільнасць да сябе. А хто з нас не марыць аб гэтым?

Абаяльнасці можна вучыцца. Засвоіўшы нават тое нешматлікае, аб чым давялося сёння пагаварыць, вы міжволі выйграеце ў вачах людзей.

В. а. рэдактара В. А. ВОЛЬСКІ

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 01077 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 259.